Весці БДПУ. Серыя 1. 2018. № 1. С. 118–122.

УДК 821.161.3:82-3»192/193»

# МАТЫЎ «ВАЙНА-КАНТЫНУУМ» У БЕЛАРУСКАЙ ПРОЗЕ 20–30-х ГАДОЎ XX СТАГОДДЗЯ

**З. І. Траццяк,**
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт; дацэнт кафедры сусветнай літаратуры і замежных моў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта*

Паступіў у рэдакцыю 04.12.17.

UDC 821.161.3:82-3»192/193»

# 'WAR CONTINUUM' MOTIF IN BELARUSIAN PROSE OF THE 1920-30S

**Z. Tratsiak,**
*PhD (Philology), Associate Professor of the Department of World Literature and Foreign Languages of Polotsk State University*

Received on 04.12.17.

У артыкуле раскрываецца спецыфіка беларускай ваеннай прозы 20–30-х гадоў XX стагоддзя, якая назапасіла шэраг прыёмаў (ад мантажу да «плыні свядомасці») для ўвасаблення сацыяльных навал, што вызначылі быццё нацыі. Практычна сінхронна мастакі слова (З. Бядуля, П. Галавач, А. Гародня, Ц. Гартны, М. Гарэцкі, М. Зарэцкі, М. Лынькоў, Я. Скрыган, К. Чорны) апавядалі пра асноўныя ваенныя і сацыяльныя катаклізмы, якія змянялі лад жыцця і спецыфіку мыслення чалавека. Айчынныя празаікі закранулі тэму «ваеннага сіндрому», разгледзелі праблемы палітычнага самавызначэння, фармулявання новых каштоўнасцей і маральна-этычных імператываў, што дапамагалі зарыентавацца ў новых надзвычайных абставінах.

*Ключавыя словы:* беларуская ваенная проза, Першая сусветная вайна, Грамадзянская вайна, вайна-кантынуум.

The article deals with the specifics of the Belarusian war prose of the 1920 - 30s. It accumulated a number of techniques (from the montage to the «stream of consciousness») for the realisation of social problems that had determined the existence of the nation. Almost simultaneously the artists (Z. Byadulya, P. Galavach, A. Harodnya, Ts. Hartny, M. Haretsky, M. Zaretsky, M. Lynkov, E. Skrygan, K. Chorny) described the basic military and social disasters that had changed the way of life and the specifics of the ordinary human thinking. Native writers spoke about the 'war syndrome'. It considered the problem of political self-determination, the formation of new values and ethical imperatives that helped to orientate in new emergencies.

*Keywords:* Belarusian war prose, World War I, the Civil War, war-continuum

Беларуская літаратура 20–30-х гадоў XX стагоддзя звярталася да падзей недалёкага мінулага: канцэптуальным было адлюстраванне Першай сусветнай вайны і змен, прынесеных 1917 годам. Ваенныя перыпетыі ўспрымаліся праз прызму лютаўскай і кастрычніцкай рэвалюцый, нямецкай акупацыі і грамадзянскага ўзброенага супрацьстаяння. Пісьменнікі не заставаліся ў баку ад мастацкай інтэрпрэтацыі падзей 1905 года. Пачатак стагоддзя, фрагментарна-алюзіўна ўключаны ў аповед, ствараў гістарычна абгрунтаваны кантэкст, што тлумачыў грамадска-палітычны выбух 1917 года. У айчынным мастацтве слова катаклізм 1914–1918 гадоў разглядаўся як прадвесце эксперымента па будаўніцтве сацыялізму. З надыходам лютаўскай рэвалюцыі ў літаратурнай спадчыне вайна часцей за ўсё адыходзіла на другі план. Яе ўдзельнікі кідаліся ў вір новых падзей, не мелі магчымасці ў статусе ветэрана забыцца на змаганне са знешнім ці ўнутраным ворагам.

Матэрыялам даследавання выступілі наступныя празаічныя творы: «Набліжэнне» З. Бядулі, «Праз гады» П. Галавача, «Варта на Рэйне» А. Гародні, «Сокі цаліны» Ц. Гартнага, «Віленскія камунары», «Дзве душы» і «Камароўская хроніка» М. Гарэцкага, «Сцежкі-дарожкі» М. Зарэцкага, «На парозе будучыні» М. Лобана, «На чырвоных лядах» М. Лынькова, «Затока ў бурах» Я. Скрыгана, «Бацькаўшчына» К. Чорнага. Узятыя ў сукупнасці, яны дазваляюць уявіць асноўныя шляхі асэнсавання нацыянальнай гісторыі ў 20–30-я гады XX стагоддзя.

Мастакі слова, пішучы пра Першую сусветную вайну, дакраналіся да звышідэалагізаванага перыяду сацыяльнага быцця, таму яны асцярожна абіралі аповедавыя стратэгіі і вылучалі станоўчых персанажаў, каб выпадкова не патрапіць у шэрагі ворагаў

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

савецкай улады, што магло мецць фатальныя для творцы наступствы. Аддаючы даніну павевам часу і ўсюдыіснай цэнзуры, З. Бядуля ў аповесці «Набліжэнне» стылізаваў адзін з урыўкаў пад ліст шараговага расійскага вайскоўца. Канцэптуальна значным быў наступны псеўдадакументальны пасаж: «Мы страшна пакутуем. Не ведаем, за што ваюем. Начальства лічыць танней за мух. Нас б'юць за малейшае непаслухмянства. <…> Не ведаем, калі і як скончыцца гэтая дзікая вайна. Некаторыя ў нас кажуць, што яна скончыцца рэвалюцыяй, як у 1905 годзе. Мы не выпусцім зброі з рук, як вернемся з вайны. Мы адплоцім тым, хто пасылае мільёны народу на вялікія пакуты» [1, с. 35–36]. Другасны персанаж з першага радка допісу ўспрымаўся як свядомы змагар за свабоду, роўнасць і братэрства. Мастак слова, на наш погляд, знарок акцэнтаваў увагу не на матыве персанальнай паразы, прыніжэння і нянавісці да прыгнятальнікаў усіх гатункаў, а звышідэалізаваў (гіпербалізаваў, рамантызаваў) «рэвалюцыйныя» пачуцці салдата-селяніна.

У дадзенай сітуацыі ўвага чытача звернута на тое, што ліст патрапіў да адрасата, мінуючы цэнзара. Гэтая акалічнасць пачынае характарызаваць не толькі часы сусветнай вайны, але і знаходзіць паралелі з быццём сучаснага З. Бядулю грамадства. Прыхаваныя сэнсы губляліся пры няўважлівым знаёмстве з творам, але яны сігналізавалі пра складаныя адносіны творцы і ўлады. Пісьменнік карыстаўся эзопавай мовай, каб выказаць свае погляды на актуальныя грамадскія працэсы і не трапіць у пастку пільных прасавецкіх літаратуразнаўцаў-вульгарызатараў.

Гіпертрафаваная ўвага да рэвалюцыйнага мыслення заўважаецца ў апавяданні «Туга старога Міхайлы» З. Бядулі. У перадсмяротным сне персанаж прадбачыў падзеі 1917 года, што суцяшалі чалавека, які марыў пра сацыяльную справядлівасць. Постаць селяніна зноў знарок узбуйнялася да маштабаў прарока камунізму.

Асобныя айчынныя мастакі слова падкрэслівалі апантанасць сацыялістычнымі ідэямі некаторых народаў Еўропы, што павінны былі спакусіцца марай пра сусветную рэвалюцыю. Характэрнымі з'яўляліся постаці персанажаў-немцаў, якія ў часы Першай сусветнай вайны разважалі пра альтэрнатыўныя шляхі светаўпарадкавання. Напрыканцы вайны персанаж аповесці «Варта на Рэйне» А. Гародні – немец Альфрэд Кляйн (маленькая шрубка ў механізме вялікага супрацьстаяння, надзеленая, паводле іроніі лёсу, узвышана-рыцарскім імем, якое выглядала ў новы час як адмысловы здзек) – апынуўся на лёсавызначальным мітынгу:

«Трыбуна-пень.
На пні стаіць шэра-жоўты шынель.
Нешта гаворыць па-расійску.
Чужыя, халодна-незразумелыя гукі.
На шчасьце – гутарка расійца перасыпана агульназразумелымі словамі:
буржуазія …
… імпэрыялізм …
… анэксіі …
… контрыбуцыі …
… мілітарызм … » [2, с. 82].

Словы хвалявалі-вабілі персанажа, які спрабаваў знайсці выйсце з асабістага крызісу, народжанага сацыяльным кліматам на радзіме, трагічным каханнем і працяглым быццём на фронце і на акупаваных немцамі тэрыторыях. Свой выбар ён зрабіў у адпаведнасці з актуальнымі павевамі часу, спадзеючыся на бездакорнасць прапанаваных ідэалаў. Тут, на наш погляд, заўважаецца запраграмаваная аўтарам наіўнасць дзейнай асобы, якая робіць высновы пад уплывам пазітыўных эмоцый і прадчуванняў, мараў пра шчасце, і свядома не імкнецца крытычна паставіцца да пачутага.

Паводле К. Чорнага (раман «Бацькаўшчына»), жыхары імперый-антаганістаў падобна адносіліся да вайны і палітычных праблем пачатку XX стагоддзя. Сваё стаўленне яны фармулявалі ў адчайнацынічнай і звышэмацыянальнай форме: «Мне кажуць – ратаваць бацькаўшчыну. Дык няхай гэтакая бацькаўшчына праваліцца скрозь зямлю, калі ў ёй я павінен ня жыць, а гніць! Гэтакую бацькаўшчыну трэба самому старацца збыць з свае галавы. Ня трэба мне ні бацькаўшчыны гэтакае, ні вайны, ні акопаў гэтых, нічога гэтага!..» [3, с. 67]. Беларусы і немцы захавалі парасткі любові да зямлі, на якой жылі, але яны зненавідзелі сучасны ім сацыяльны лад, што атручваў чалавечае існаванне, прыніжаў асобу і вымагаў ад яе імперска-патрыятычнага пафасу.

Нягледзячы на грамадскую запраграмаванасць на крытыку падзей Першай сусветнай вайны і ўхвалу 1917 года, беларускія пісьменнікі даводзілі да чытача, што «рэвалюцыя ператвараецца ў крывавы вір, калі не знаходзіць духоўных і рацыянальных сіл па

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

зняццю канфліктаў у супрацлеглых бакоў у разуменні сутнасці вырашаемага ёю пытання» [4, с. 42]. У дадзеным кантэксце згадаем заканчэнне аповесці «Набліжэнне» З. Бядулі: галоўны персанаж адчуваў, што ён знаходзіцца на прадвесці падзеі, гіпатэтычна роўнай па адмоўных наступствах з вайной, апафеозам якой былі татальнае забойства, сыход у бежанства, абвастрэнне міжэтнічных праблем. М. Гарэцкі (аповесць «Дзве душы») стварыў вобраз адыёзнага рэвалюцыянера Гаршчка, які, не маючы маральна-этычнага стрыжню і здольнасці да самастойнага мыслення, далучыўся да тых сіл, што дазволілі яму адчуць смак татальнай улады над слабейшымі.

Айчынныя мастакі слова карысталіся матывам «навалы-кантынуума», каб увасобіць спецыфіку грамадска-палітычных працэсаў першай трэці ХХ стагоддзя. Малюючы першыя тыдні сусветнай вайны, апавядальнік у рамане «Затока ў бурах» Я. Скрыгана разважаў пра звыштрагічны момант гісторыі так: «Палыны і межы. Дарогі горкнуць пылам. Па іх <…> цягнуцца фурманкі. <…> Едуць нававбранцы. Едуць, ідуць пехатою, яшчэ больш падымаючы пыл. Іх праводзяць бацькі, мацяркі, сёстры, браты. <…> Усё перамешана з тугою і смагаю, з потам і слязьмі, з адчаем і – з святой чалавечай надзеяй» [5, с. 7]. Гэты ўрывак набывае архетыповае гучанне, бо і продкі, і нашчадкі ўдзельнікаў вайны 1914–1918 гадоў таксама спазналі ўплыў розных катаклізмаў (ад сацыяльных да тэхнагенных), што не спрыялі нацыянальнай самаідэнтыфікацыі беларусаў, росту іх матэрыяльнага дабрабыту і ўмацаванню маральных асноў.

Творцы падавалі эпізоды з жыцця персанажаў, якія, патрапіўшы на фронт у 1914 годзе, вярталіся ў родныя мясціны праз шмат год, каб даведацца, што іх дзеці пайшлі па ваенных дарогах. У такіх умовах звычайнымі станавіліся дыялогі кшталту пададзенага П. Галавачом у рамане «Праз гады»:

«− Ты цяпер ужо зусім дадому? Добра, акурат да часу прыедзеш; сын з дому, а бацька дадому. Ці ты, можа, пра сына і не ведаеш яшчэ?

− А што? – уставіўся ў Міколаў твар Тарэнта адным сваім вокам.

− Ваяваць пайшлі: і твой, і мой, і Ёська кавалёў.

− Як гэта пайшлі, – не разумеў Тарэнта. – Куды?

– Ваяваць, я ж кажу …

– Такі ў войска пайшлі? – усё яшчэ не верыць Тарэнта.

– А няўжо ж куды. <…>

– Як жа гэта? – усхвалявана замітусіўся на возе Тарэнта. – Які ж з яго ваяка? Дзіця горкае <…> Не было каму крыкнуць яго» [6, с. 220–221]. Вырваныя са звычайнай плыні жыцця, салдаты, якія перажылі падзеі 1914–1918 гадоў, абвострана адчувалі, што натуральная повязь розных пакаленняў сям'і і сялянскага роду знікла. І людзі больш сталага ўзросту, і моладзь змянялі погляды на жыццё.

Персанажы, якія вярталіся з Першай сусветнай вайны, сутыкаліся з новым ладам мыслення, што патрабаваў не толькі адаптацыі, але і складанага выбару. Асоба павінна была палітычна вызначыцца, бо застацца ў баку ад рэвалюцыйных падзей не ўяўлялася магчымым. Пратаганісты, якія не паспелі захапіцца марамі пра дыктатуру пралетарыята, сумняваліся ў правамоцнасці сацыялістычнага будаўніцтва, у шэрагу выпадкаў імкнуліся да нацыянальнага (а не інтэрнацыянальнага) грамадскага ўпарадкавання. Паводле М. Гарэцкага, сітуацыя выглядала так: «калі адзін голас кажа: "Ідзі ў партыю!" – другі голас насміхаецца над сваёю ж палавінкаю і быццам з нейкай нядобрай уцехаю шэпча: "Няма табе партыі! Няма табе партыі!"» [7, с. 36]. У дадзеным выпадку пачыналася «вайна» з сабою, бо дзейная асоба, з аднаго боку, імкнулася захаваць свае погляды (як аснову для ўласнага пачуцця годнасці), з другога, агрэсіўная палітыка ўлад выклікала жах і актывавала ахоўныя механізмы псіхікі. Персанаж пагаджаўся з ганебнымі, на яго погляд, рэчамі, каб захаваць права на больш-менш прыстойнае існаванне, кіраваўся ў духоўную эміграцыю.

Сацыяльны-катаклізм кантынуум увабраў і іншыя фактары: усталяванне трывалай мяжы паміж заходнімі і ўсходнімі часткамі тэрыторыі, на якой кампактна жылі этнічныя беларусы, наладжванне сацыялістычнай гаспадаркі (індустрыялізацыя, калектывізацыя), палітыка беларусізацыі, пачатак Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войн. Гістарычныя трасфармацыі адбіліся на псіхіцы некалькіх пакаленняў, што пакутавалі на «ваенны сіндром», які меў розныя паталагічныя праявы «ад самагубства, да характэрнай <…> манеры апранацца ў гімнасцёркі, галіфэ і боты. Ён <…>

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

выяўляюся ў агульным стане заўсёднай мабілізацыйнай падрыхтаванасці, што падтрымлівалася ва ўмовах <…> класавай барацьбы» [8, с. 303].

Назіранні ваенных антраполагаў удакладняліся і мастацкай літаратурай, што падавала каларытныя прыклады. М. Лынькоў у аповесці «На чырвоных лядах» прапанаваў маналог персанажа-інваліда, для якога франтавое быццё скончылася, а выйсце з вайны так і не надышло: «як адняліся ногі, дык колькі часу таго ляжаў. Ды адчуняючы ізноў ляжаў. Ды-й цяпер хіба здатны да працы. Вот і вольны час. І ходзяць ходарам думкі, снуюць у несусветныя карагоды. Аб вайне – дзіва то, крыві колькі паплыло тае. Пра цара – спаймаў-бы, здаецца яго, ды тымі кульцяпкамі па пысе яго, па пысе – ці-ж гэта табе на народ звод пускаць, на людзей згубу чорную» [9, с. 117]. Вайна не стала ўспамінам, бо нагадвала пра сябе і фізічным станам, і новымі (у асноўным крытычнымі) думкамі пра побыт, грамадскае існаванне, чалавечыя ўзаемаадносіны.

У апавяданні Я. Коласа «Балаховец» паўстаюць іншыя праявы «ваеннага сіндрому». Галоўны персанаж (Іван Бадзейка) шлях вайскоўца і авантурыста пачаў на Першай сусветнай вайне. Неўпарадкаваны побыт, прыгоды, інтрыгуючыя сустрэчы прышліся да спадобы, і таму пасля рэвалюцыі героя «проста да крыві і рызыкі пацягнула» [10, с. 363]. Яго вопыт «узбагаціўся» бандытызмам і службай у войску Балаховіча. Такая дзейная асоба не магла знайсці выйсце са стану барацьбы, што стала сэнсам быцця. У мірных умовах персанаж адчуваў, што яго існаванне – пераадоленне кагнітыўнага дысанансу: «Няёмка было Івану дома. І сярод родных і сваякоў, і так на людзях <…> заўважаў Іван <…>, што ён стаіць па іншы бок ад людзей <…> Яму здавалася, што людзі староняцца яго, і ён не можа знайсці агульнага грунту з імі. <…> І ніхто не мае тут патрэбы ў ім, усе ролі размяркованы, а для яго не знаходзіцца» [10, с. 375]. Паводле Я. Коласа, Іван Бадзейка не змог стаць арганічнай часткай грамадства, што не збіралася ўсур'ёз успрымаць яго перавыхаванне і вяртанне да ўнармаванага быцця. Абыякавасць родных і аднавяскоўцаў хавала падазронасць і канкрэтна не матываваную нянавісць, якія і прадвызначылі трагічны фінал апавядання.

Матыў «вайна-кантынуум» прасочваецца ў межах аднаго твора. У рамане М. Лобана «На парозе будучыні» гісторыя сям'і Шэметаў звязана з бясконцымі ўзброенымі канфліктамі: першы чалавек з роду з'явіўся ў Некрашах за дзесяць год да турэцкай вайны, быццё яго нашчадкаў пасля японскай вайны ўскалыхнула чутка пра царскі ўказ, паводле якога зямля перадавалася ва ўласнасць сялян. Па першым часе ўзброеныя канфлікты паўставалі як фон, адцянялі будзённасць існавання. Унук заснавальніка рода Шэметаў на пачатку XX стагоддзя гуляў у вайну: «усе хлапчукі пароўну дзяліліся і, разышоўшыся ў розныя бакі, пачыналі збіраць на полі каменне і шпурляць з прашак у свайго “праціўніка”» [11, с. 28]. Хутка гэтае пакаленне патрапіла ў віхуру Першай сусветнай вайны і рэвалюцыі. Потым «перыяд перадышкі для Савецкай Рэспублікі скончыўся <…> кайзераўская Германія парвала пагадненне аб перамір'і і пайшла ў наступленне. Напярэдадні ішоў польскі легіён» [11, с. 223]. Далей «ішоў трывожны дзевятнаццаты год. Тысяча смярцей высочвала “пракляццем закляймёнага” чалавека: белагвардзейская куля, кулацкі нож, голад і пошасць» [11, с. 290]. Увесь раман прасякнуты пачуццём блукання па пакутах чалавека, які быццам бы спазнаваў пекла Дантэ, актуалізаванае новым часам.

Матыў «вайна-кантынуум» звязаны з эпапейна-хранікальным ладам мыслення асобных аўтараў. М. Гарэцкі («Камароўская хроніка») ці М. Лобан (трылогія пра сям'ю Шэметаў) літаральна не маглі скончыць аповед, бо рэчаіснасць, якую яны адлюстроўвалі, прапаноўвала новыя выпрабаванні, і выключыць іх са старонак твора было немагчымым, як і спыніць плынь вынішчэння.

Першая сусветная вайна і рэвалюцыя дазволілі айчынным мастакам слова засяродзіцца на тэмах, якія не паспелі стаць магістральнымі ў новай беларускай літаратуры. Нягледзячы на тое, што ваенныя падзеі здаўна цікавілі нашу прозу і паэзію, трэба зазначыць, што мастацкія традыцыі адлюстравання баявых дзеянняў перапыняліся (у адрозненне ад бясконцай плыні ўзброеных канфліктаў і сацыяльных навал), таму ў першай трэці XX стагоддзя прыйшлося адраджаць-фарміраваць прынцыпы развіцця літаратурнай баталістыкі ў сувязі з надзёнымі кірункамі развіцця айчыннага пісьменства. Паралельна з фармуляваннем новай канцэпцыі беларускай прозы і паэзіі пра вайну адбывалася і засваенне абумоўленых спецыфікай часу форм выкладу ма-

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

тэрыялу (адвольнае спалучэнне-ўзаемапранікненне дакументальнага, аўтабіяграфічнага і мастацкага; выкарыстанне мантажу як адмысловай формы ўвасаблення асацыятыўнага мыслення асобы, што жыве ў «звіхнутых» часе і прасторы; эксперыменты з унутраным маналогам і «плынню свядомасці», іншымі нерэалістычнымі прыёмамі; дапасаванне вайсковай тэрміналогіі, салдацкага жаргону да патрэб літаратуры; асіміляцыя тых лексічных пластоў, што дазвалялі выкласці гісторыю нараджэння і першых гадоў станаўлення краіны Саветаў; актуалізацыя набыткаў вуснай народнай творчасці, што згубіліся на фоне ваеннага і рэвалюцыйнага фальклору). Вылучалася і новая тэматыка: быццё горада ў часы войнаў і рэвалюцый («Сокі цаліны» Ц. Гартнага, «Віленскія камунары» М. Гарэцкага), міжэтнічныя зносіны ў межах былой Расійскай імперыі («Набліжэнне» З. Бядулі), успрыманне навалы персанажам-селянінам, прадстаўніком мяшчанства ці інтэлігентам у першым пакаленні («На імперыялістычнай вайне» М. Гарэцкага), татальнае бежанства («Бацькаўшчына» К. Чорнага), захаванне нацыянальнай ідэнтычнасці («Рускі», «Дзве душы» М. Гарэцкага).


### Літаратура

1. *Бядуля, З.* Набліжэнне: Аповесць / З. Бядуля. – Менск : Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі, Сектар мастацкай літаратуры, 1936. – 230 с.
2. *Гародня, А.* Варта на Рэйне / А. Гародня. – Менск : Беларускае дзяржаўнае выдавецтва, 1930. – 122 с.
3. *Чорны, К.* Бацкаўшчына / К. Чорны. – Менск : ДВБ ЛіМ, 1932. – 156 с.
4. *Шаладонаў, І.* Выпрабаванне чалавечнасці: Беларускае апавяданне 20-х гадоў аб рэвалюцыі і грамадзянскай вайне / І. Шаладонаў. – Мінск : Беларуская навука, 2008. – 175 с.
5. *Скрыган, Я.* Затока ў бурах / Я. Скрыган // Выбраныя творы ў двух тамах. – Т. 2. – Апавяданні. Аповесці. Літаратурны роздум. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1985. – С. 7–55.
6. *Галавач, П.* Праз гады: Раман / П. Галавач. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1984. – 368 с.
7. *Гарэцкі, М.* Дзве душы / М. Гарэцкі // Творы: Дзве душы: Аповесць. Апавяданні. Жартаўлівы Пісарэвіч: П'еса. Літаратурная крытыка і публіцыстыка. Лісты. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1990. – С. 6–106.
8. *Тяжельникова, В.* «Военный синдром» в поведении коммунистов 1920-х гг. / В. Тяжельникова // Военно-историческая антропология. Предмет, задачи, перспективы развития. – М. : «Российская политическая энциклопедия» (РОССПЭН), 2002. – С. 291–305.
9. *Зарэцкі, М.* Сьцежкі-дарожкі / М. Зарэцкі. – Менск : Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі, 1928. – 396 с.
10. *Колас, Я.* Балаховец / Я. Колас // Збор твораў: у 14 т. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1973. – Т. 5: Апавяданні паслякастрычніцкага перыяду і «Казкі жыцця». – С. 359–390.
11. *Лобан, М.* На парозе будучыні / М. Лобан // Выбраныя творы. – Мінск : Беларуская навука, 2015. – С. 21–328.

### References

1. *Biadulia, Z.* Nabližennie: Apoviesć / Z. Biadulia. – Miensk : Dziaržaŭnaje vydaviectva Bielarusi, Siektar mastackaj litaratury, 1936. – 230 p.
2. *Harodnia, A.* Varta na Rejnie / A. Harodnia. – Miensk : Bielaruskaje dziaržaŭnaje vydaviectva, 1930. – 122 p.
3. *Čorny, K.* Backaŭščyna / K. Čorny. – Miensk : DVB LiM, 1932. – 156 p.
4. *Šaladonaŭ, I.* Vyprabavannie čalaviečnasci: Bielaruskaje apaviadannie 20-ch hadoŭ ab revaliucyi i hramadzianskaj vajnie / I. Šaladonaŭ. – Minsk : Bielaruskaja navuka, 2008. – 175 s.
5. *Skryhan, Ja.* Zatoka ŭ burach / Ja. Skryhan // Vybranyja tvory ŭ dvuch tamach. – T. 2. – Apaviadanni. Apoviesci. Litaraturny rozdum. – Minsk : Mastackaja litaratura, 1985. – P. 7–55.
6. *Halavač, P.* Praz hady: Raman / P. Halavač. – Minsk : Mastackaja litaratura, 1984. – 368 p.
7. *Harecki, M.* Dzvie dušy / M. Harecki // Tvory: Dzvie dušy: Apoviesć. Apaviadanni. Žartaŭlivy Pisarevič: Pjesa. Litaraturnaja krytyka i publicystyka. Listy. – Minsk : Mastackaja litaratura, 1990. – P. 6–106.
8. *Tyazhel'nikova, V.* «Voyennyy sindrom» v povedenii kommunistov 1920-kh gg. / V. Tyazhel'nikova // Voyenno-istoricheskaya antropologiya. Predmet, zadachi, perspektivy razvitiya. – M. : «Rossiyskaya politicheskaya entsiklopediya» (ROSSPEN), 2002. – S. 291–305.
9. *Zarecki, M.* Ścieżki-darožki / M. Zarecki. – Miensk : Dziaržaŭnaje vydaviectva Bielarusi, 1928. – 396 p.
10. *Kolas, Ja.* Balachoviec / Ja. Kolas // Zbor tvoraŭ: u 14 t. – Minsk : Mastackaja litaratura, 1973. – T. 5: Apaviadanni pasliakastryčnickaha pieryjadu i «Kazki žyccia». – P. 359–390.
11. *Loban, M.* Na parozie budučyni / M. Loban // Vybranyja tvory. – Minsk : Bielaruskaja navuka, 2015. – S. 21–328.


РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ